16. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 36. – Д. 979.
17. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 36. – Д. 3572.
18. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 29. – Д. 505.
19. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 36. – Д. 3575.
20. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 29. – Д. 546.
21. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 36. – Д. 3316.
22. РГВА. – Ф. 9. – Оп. 36. – Д. 3773.
23. РГВА. – Ф. 35086. – Оп. 1. – Д. 257.
24. РГВА. – Ф. 35086. – Оп. 1. – Д. 256.
25. РГВА. – Ф. 35086. – Оп. 1. – Д. 664.
26. РГВА. – Ф. 35086. – Оп. 1. – Д. 255.
27. РГВА. – Ф. 35086. – Оп. 1. – Д. 264.
28. Токарев, В.А. Советское общество и польская кампания 1939 г.: «Романтическое ощущение войны» / В.А. Токарев // Человек и война: война как явление культуры / Под ред. И.В. Нарского, О.Ю. Никоновой. – М.: АИРО-ХХ, 2001. – С. 399 – 418.

## ДА ПЫТАННЯ ДЗЕЙНАСЦІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ М. МОТАЛЬ, ДРАГІЧЫНСКАГА ПАВЕТА)

**Рамановіч П.С.**
УО «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

Мірны дагавор, які быў падпісаны 18 сакавіка 1921 г. у Рызе прадстаўнікамі Польшчы, РСФСР і УССР, абвяшчаў: стан вайны паміж імі спынены. Паводле Рыжскага дагавора частка заходнебеларускіх зямель (Гродненская губернія, усходнія раены Віленскай і заходнія раёны Мінскай губерній) адыйшла ва ўладанне польскай дзяржавы. На тэрыторыі Заходняй Беларусі (больш за 100 тыс. кв. км) пражывала звыш 4 млн. чалавек, у тым ліку беларусы складалі 67 %, палякі – 12-13 %, яўрэі – 9 %, украінцы – 5-6 %, літоўцы – 3 %, рускія – 2 % [1, с. 221].

Прававы статус беларусаў у польскай дзяржаве вызначаўся як Версальскім 1919 г., так і Рыжскім 1921 г., дагаворамі. У артыкуле VII Рыжскага мірнага дагавора сцвярджалася, што "Польшча прадстаўляе асобам рускай, украінскай і беларускай нацынальнасцей на аснове раўнапраў'я нацыянальнасцей усе правы, што забяспечваюць свабоднае развіцце культуры, мовы і выканання рэлігійных абрадаў " [2, с. 258].

Палітыка кіраўнікоў польскай дзяржавы на тэрыторыі Заходняй Беларусі мела вялікадзяржаўны, шавіністычны, каланізацыйны накірунак. Беларусы разглядаліся як этнаграфічная група, яны не маглі займаць не толькі кіруючых пасад, але і працаваць на дзяржаўнай службе. У дзяржаўных установах не дазвалялася карыстацца беларускай мовай, культурнае жыццё беларускага народа пастаянна абмяжоўвалася і падаўлялася, закрываліся беларускія школы (у 1938/39 навучальным годзе не існавала ні адной беларускай навучальнай установы, апошняя беларуская гімназія ў Вільні, ў якой навучалася каля 200 вучняў, была ператворана ў філіял польскай гімназіі).

У паланізацыі беларускага насельніцтва значную ролю адыгрывала каталіцкая царква (з 500 існаваўшых у Заходняй Беларусі праваслаўных цэркваў больш за 300 сталі каталіцкімі

касцёламі). Касцёл лічыўся гарантам польскасці на ўсходніх землях Польшчы, адбывалася каланізацыя беларускіх зямель (да верасня 1939 г. было населена каля 10 тыс. асаднікаў, якія атрымалі зямельныя ўчасткі па 15-45 га). У дапаўненне да нацыянальнага і сацыяльнага прыгнету панаваў жорсткі палітычны рэжым.

Нацыянальная палітыка польскага урада ставіла мэту фарміраваць у літоўцаў, беларусаў, украінцаў польскую грамадзянскую свядомасць, пераконваць іх, што Другая Рэч Паспалітая з'яўляецца іх айчынай.

Этнічныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. значна адрозніваліся ад тых, што адбываліся ў БССР. Польскія ўлады праводзілі асіміляцыю беларускага насельніцтва праз друк, школу, каталіцкую царкву.

У такіх ўмовах у Заходняй Беларусі фарміруецца дэмакратычны лагер, які акцэнтаваў сваю дзейнасць у абарону палітычных, сацыяльных і нацыянальных інтарэсаў беларусаў. Беларускі нацыянальна-дэмакратычны рух (КПЗБ, БСРГ, БПК, Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя, сялянска-рабочы клуб "Змаганне") знайшоў сабе вялікае кола прыхільнікаў сярод розных навуковых, гаспадарчых, культурна-асветніцкіх арганізацый (ТБШ, Народны Хаўрус "За Бацькаўшчыну", Беларуская хрысціянская дэмакратыя, беларускія эсэры і інш.).

Камуністычны напрамак палітычнага руху Заходняй Беларусі быў прадстаўлены Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі (утварылася ў 1923 г. як аўтаномная камуністычная арганізацыя КПРП, з уласным ЦК). У 1924–1929 гг. існавала 6 акруговых камітэтаў КПЗБ: Беластоцкі, Брэсцкі, Віленскі, Гродзенскі, Слонімска-Баранавіцкі, Пінскі. Арганізатарамі і кіраўнікамі КПЗБ у розныя гады яе дзейнасці былі І.К. Лагіновіч (Павел Корчык), А.А. Альшэўскі, С.А. Дубовік, М.С. Арэхва, Л.Н. Славінскі (сапр. Качароўскі), Л.У. Радзевіч, А.У. Канчэўскі і інш. Друкаванымі органамі ЦК КПЗБ былі газета "Чырвоны сцяг", часопіс "Бальшавік", у розныя гады выдаваліся на беларускай, польскай, рускай і яўрэйскай мовах газеты "Партработнік", "Да барацьбы", "Весткі з СССР", "Куйце зброю", "Голас салдата", "Чырвоны сцяг" і інш.

У канцы 20-х гг. уплыў КПЗБ адчуваўся амаль на ўсёй тэрыторыі З. Беларусі. Камуністычныя арганізацыі існавалі ў гарадах, мястэчках і некаторых вёсках. На думку П. Корчыка "КПЗБ перастала быць арганізацыяй Беластока і Вільні, а стала сапраўды масавай партыяй, якая арганізуе шырокія пласты беларускага сялянства на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі" [3, с. 400].

У мястэчку Моталь (Драгічынскі павет, Палескае ваяводства) у 1926 г. ствараецца падпольная група КПЗБ, якая налічвала амаль 30 чалавек (сакратар групы А.Г. Бабрыковіч). Арганізацыя існавала ў канспяратыўных умовах. Любыя праяўленні камуністычнага руху падвяргаліся ганенням, у камуністычныя і камсамольскія арганізацыі засылаліся агенты дэфензівы. У такіх умовах члены КПЗБ ў сваёй дзейнасці выкарыстоўвалі легальны гурток Беларускай сялянска-работніцкай Грамады (БСРГ), палітычная платформа якой (самавызначэнне Заходняй Беларусі, устанаўленне дэмакратычных свабод, нацыянальная роўнасць, свабода сумлення, звальненне палітчных зняволеных) была сфарміравана камуністамі. Яны агітавалі аднавяскоўцаў на правядзенне мітынгаў, выступленняў пратэсту супраць ганенняў на Б. Тарашкевіча, С. Рак-Міхайлоўскага, П. Мятлы, П. Валошына, М. Бурсевіча і іншых кіраўнікоў БСРГ. Штодзённай справай арганізацыі была праца сярод жыхароў мястэчка. У дні рэвалюцыйных свят члены арганізацыі вывешвалі на людных месцах чырвоныя сцягі, распаўсюджвалі сярод жыхароў мястэчка лістоўкі, прызывалі аднавяскоўцаў не плаціць падаткі. Сяляне прыслухоўваліся да заклікаў камуністаў аб барацьбе за лепшую долю.

Усе члены падпольнай арганізацыі КПЗБ уваходзілі ў склад мясцовай групы Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам (МАДР). У фонд МАДР збіраліся грошы для дапамогі палітычным вязням. Мясцовай касай МАДР кіраваў сакратар падпольнай арганізацыі КПЗБ А.І. Райкевіч.

Польскія камуністы аказвалі дапамогу КПЗБ літаратурай і кадрамі. Так, Мотальская група некалькі разоў атрымлівала газеты і іншую літаратуру з Беластока. А.Г. Бабрыковіч перабіраўся ў БССР і прыносіў прапагандыска-партыйную літаратуру.

У справаздачы Пінскага павятовага старасты ад 2 сакавіка 1927 г. адзначалася: "У склад Драгічынскага райкома ўваходзіць 5 падрайкомаў:

№ 1 – у Драгічыне, 8 ячэек, 45 чалавек;

№ 2 – у Моталі, 8 ячэек, 45 чалаве;

№3 – у Бездзежы , 9 ячэек, 60 чалавек;

№ 4 – у Іванаве, 5 ячэек, 31 чалавек;

№ 5 – у Драгічыне, 8 ячэек, 40 чалавек.

Усяго ў складзе райкома 121 камуніст, 120 камсамольцаў, 130 "сімпатыкаў" (спачуваючых), 38 ячэек, якія ахопліваюць 98 вёсак" [4,с. 128–129].

У 1931 г. дэфензіва арыштавала сакратара Мотальскай падпольнай арганізацыі КПЗБ А.Г. Бабрыковіча. На чале арганізацыі становіцца А.І. Райкевіч. Але хваля рэпрэсій працягвалася. Летам 1934 г. былі арыштаваны А.І. Райкевіч, С.І. Палто, Я.Ф. Валынец, С.А. Мацукевіч, І.А. Духовіч, Р.М. Жыховіч, Д.Л. Калілец, С.Р. Шыкалай, І.Ф. Валынец і многія іншыя. Арыштаваных жорстка білі, здзекваліся над імі, а на хатах, дзе жылі падпольшчыкі, абадралі стрэхі.

Стараста Драгічынскага павета у дакладной кіраўніцтву Палескага ваяводства ад 15 верасня 1934 г. канстатаваў: "У час ліквідацыі Пінскага АК КПЗБ з рэзідэнцыяй у в. Калілы і РК КСМЗБ у Моталі і належачых да іх ячэек 11 і 13 верасня затрыманы і знаходзяцца ў турме:

Сулім Іван – кіраўнік тэрарыстычнай арганізацыі;

Мацукевіч Іван – сакратар ячэйкі камсамола ў Моталі;

Валынец Якаў – член тэрарыстычнай арганізацыі ў Моталі;

Валынец Іван – член тэрарыстычнай арганізацыі ў Моталі;

Духовіч Ілья – член тэрарыстычнай арганізацыі ў Моталі, аддадзены пад нагляд паліцыі" [5, арк.19].

28 студзеня 1935 г. у Драгічыне адбылася выязная сесія Пінскага акруговага суда. Па справе камуністычных арганізацый праходзіла 29 чалавек. Члены Мотальскай арганізацыі КПЗБ А.І. Райкевіч, С.І. Палто, І.К. Мацукевіч, І. Суліма атрымалі па чатыры гады турэмнага зняволення.

Пасля арышту старэйшых таварышаў на змену прыйшла моладзь. У падпольную дзейнасць актыўна ўключыліся І.М. Калілец, І.С. Кульбеда, П.К. Кульбеда, П.І. Мінюк, А.С. Міховіч, С.С. Міховіч і інш.

Пад кіраўніцтвам Мотальскай арганізацыі КПЗБ дзейнічала арганізацыя КСМЗБ. Сактаратаром камсамольскай арганізацыі быў С.А. Кузюр. Члены КСМЗБ вялі агітацыйную работу сярод моладзі мястэчка, распаўсюджвалі сярод насельнцтва газету "Чырвоны сцяг" і часопіс "Бальшавік". На іх старонках паведамлялася аб цяжкай долі рабочых і сялян, расказвалася пра забастоўкі сялян на вывазцы лесу, аб іх барацьбе супраць памешчыкаў. У 1927 г. паліцыя арыштавала С.А. Кузюра, але яму ўдалося ўцячы і перабрацца ў БССР. Арганізацыю ўзначаліў М.М. Мінюк.

У паведамленні (29 жніўня 1934 г. ) намесніка пракурора С. Петрусевіча аб дзейнасці падпольнага райкома КСМ ў Моталі гаварылася: "Паводле сабранай інфармацыі, падпольны райком КСМ у Моталі распаўсюджвае сваю дзейнасць на ўсю Мотальскую гміну, поўнач Янаўскай і паўночна-ўсходнюю частку Бездзежскай гміны… Вельмі актыўныя маладзёжныя ячэйкі, якімі кіруюць выдатныя дзеячы кампартыі… Па ўдакладнёных звестках структура арганізацыі цяпер наступная: сакратар – Сулім Іван, жыхар вёскі Моталь; інструктар – Балюк Іван, жыхар вёскі Трыліскі; казначэй – Наумавец Уладзімір, жыхар вёскі Дружылавічы…Па ініцыятыве Балюка Івана ў Моталі Сулім Іван стварыў "Тэрарыстычны суд". Члены камуны дэзарганізавалі ўсе мясцовыя таварыствы і легальныя саюзы так, што большасць членаў гэтых саюзаў выйшла са сваіх арганізацый, баючыся помсты…" [6, арк. 21].

Амаль уся моладзь мястэчка знаходзілася пад ўплывам камсамольцаў. Хлопцы і дзяўчаты вечарамі спявалі забароненыя рэвалюцыйныя і савецкія песні. У часы свят праводзіліся зборы моладзі некалькіх вёсак. Падпольшчыкі дзяліліся інфармацыяй і атрымлівалі заданні для далейшай працы. У 1938 г. на чале камсамольскай арганізацыі становіцца І.М. Калілец, які заставаўся важаком да ўстанаўлення савецкай улады.

Нягледзячы на рэпрэсіі, мотальскія арганізацыі КПЗБ і КСМЗБ мацнелі, іх уплыў быў вялікі не толькі на жыхароў, але і на школьную моладзь. Так, дырэктар Мотальскай школы С. Шымчак у даносе ад 1 снежня 1938 г. паведамляў:"…Я, дырэкар сямігадовай школы ў м. Моталь, некалькі тыдняў таму назад у старэйшых класах даручанай мне школы заўважыў, што сярод вучняў (хлопчыкаў) вядзецца нейкая антышкольная кампанія, якая праяўляецца ў наступным: вучні (хлопчыкі) наўмысна не жадаюць адказваць настаўніцы зададзеныя ім урокі, спяваць польскія песні, не жадаюць наведваць школу, варожа адносяцца да настаўнікаў, адмаўляюцца ўдзельнічаць у дзейнасці школьных арганізацый "Харцэж", "Арлята" і ў школьным хоры.

Маючы на ўвазе вышэй сказанае, я пачаў весці назіранне за школьнай моладдзю з мэтай вызначэння ініцыятараў названых антышкольных выступленняў і прыйшоў да вываду, што вучні Жыховіч Антон, сын Сяргея, 13 гадоў, Мазько Янг, сын Яна, 12 гадоў, Ксёнда Міхаіл, сын Гаўрылы, 12 гадоў, Васілевіч Рыгор, сын Васіля, 12 гадоў, Філіновіч Аляксандр, сын Аляксея, 11 гадоў, і Міховіч Сцяпан, сын Федара, 13 гадоў – усе жыхары Моталя, вучні 5-га класа, за выключэннем Філіновіча Аляксандра, які з'яўляецца вучнем 3-га класа, тэрарызуюць вучняў, забараняюць ім пад пагрозай збівання прымаць удзел у якіхнебудзь польскіх школьных арганізацыях.

…Як выцякае з вышэй сказанага, пералічаныя вучні маюць камуністычныя погляды і вельмі хочуць адбіць жаданне ў школьнай моладзі вучыцца ў школах з настаўніцтвам на польскай мове і падбухторваюць яе варожа адносіцца да ўсяго польскага…" [7, с. 55–56].

З узмацненнем рэпрэсій і праследаванняў з боку польскай паліцыі (у 1937 г. пракаціліся тры рэпрэсіўныя хвалі) частка падпольшчыкаў пакінула Заходнюю Беларусь і перайшла ў Савецкі Саюз. Застаўшыяся члены групы працягвалі дзейнасць. Каб больш паспяхова весці прапаганду сярод насельніцтва ў дамах асобных жыхароў (Г.Х. Данілевіча, В.І. Маліча, І.К. Кузюра) былі ўстаноўлены дэтэктарныя радыёпрыёмнікі для праслухоўвання радыёперадач з Масквы і Мінска. Паведамленні распаўсюджваліся сярод падпольшчыкаў і насельніцтва Моталя. Такая праца праводзілася да восені 1939 г.

Ва ўмовах нарастання барацьбы працоўных і значных поспехаў па стварэнні адзінага народнага фронту Кампартыя Польшчы і яе састаўная часткі – КПЗБ і КПЗУ – у сакавіку 1938 г. былі распушчаны і перасталі існаваць. У 1936–1937 гг. былі арыштаваны,

выкліканыя ў СССР кіруючыя работнікі КПЗБ: І.К. Лагіновіч, М.С. Майскі, М.П. Маслоўскі, А.С. Славінскі, В.З. Харужая і шэраг іншых камуністаў. Большасць з іх загінула ў сталінскіх турмах, або лагерах НКУС. Было сфабрыкавана абвінавачванне, што яны з'яўляюцца агентамі польскай дэфензівы. Былыя члены КПЗБ не спынілі сваёй дзейнасці, яны у 1939 г. актыўна дапамагалі ўстанаўленню савецкай ўлады.

1 верасня 1939 г. Германія напала на Польшчу. Яе народ першы ўзняўся на абарону свайго нацыянальнага існавання. Але Польшча акзалася непадрыхтаванай у ваенна-палітычных адносінах да абароны дзяржаўнай незалежнасці. Нягледзячы на мужнае супраціўленне польскай арміі, урад і ваеннае камандаванне не змаглі арганізаваць эфектыўную абарону і 17–18 верасня 1939 г. выехалі ў Румынію, а затым у Францыю і Англію. Амаль уся тэрыторыя карэннай Польшчы была занята нямецкімі войскамі.

Ва ўмовах выхаду германскай арміі на этнічныя беларускія землі савецкі ўрад аддаў распараджэнне Чырвонай Арміі ўзяць пад абарону тэрыторыі Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

17 верасня 1939 г. войскі Чырвонай Арміі пачалі паход у Заходнюю Беларусь. Па дагаворы аб сяброўстве і межах, падпісаным СССР і Германіяй 28 верасня 1939 г. мяжа "дзяржаўных інтарэсаў" была ўстановўлена па рэках Сан і Заходні Буг.

18 верасня 1939 г. члены КПЗБ вывесілі чырвоны сцяг на будынку паліцэйскага пастарунка Моталя, раззброілі асаднікаў і ляснічых, стварылі атрад народнай міліцыі з жыхароў мястэчка. Маталяне ўрачыста рыхтаваліся да сустрэчы чырвонаармейцаў. На вуліцах пры ўездзе ў мястэчка былі пабудаваны і ўпрыгожаны аркі з партрэтамі Сталіна, Молатава, Варашылава. 21 верасня у м. Моталь увайшлі часці Чырвонай Арміі. Жыхары з транспарантамі, чырвонымі сцягамі сустракалі чырвонаармейцаў.

У Моталі стравараецца грамадзянскае кіраванне. Старшынёй Мотальскага пасялковага Савета абралі Н.В. Райкевіча, сакратаром – П.М. Палто. Камендантам мясцовай міліцыі зацвердзілі М.М. Мінюка.

Робячы высновы, можна адзначыць, што беларускі народ не мірыўся з прыгнечаным становішчам і змагаўся за сацыяльную і нацыянальную незалежнасць. Барацьба працоўных мела вялікае значэнне для ўз'яднання беларускага народа і захавання яго як этнасу. Яна садзейнічала развіццю нацыянальнай і палітычнай свядомасці. У гэтай барацьбе здабывалі вопыт палітычныя партыі, рухі, нацыянальна-вызваленчыя арганізацыі

**Літаратура**


1. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. ч.2 / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск: Беларусь, 1995. – 560 с.

2. Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 1 (1917-1922). – Мінск: Навука і тэхніка, 1997. – 240 с.

3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 1. А – Беліца / Беларус. Энцыкл. Рэдкал.: М.В. Біч і інш. – Мінск: БелЭн. 1993. – 494 с.

4. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага р-на. – Мінск: БЕЛТА. 2000. – 592 с.

5. Отчёты отдела общественной безопасности Полесского воеводского управления, органов полиции, донесения поветовых старост о ликвидации ОК КПЗБ в Пинске и РК КПЗБ в Мотоле Дрогичинского повета // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці / (ДАБВ) / – Ф. 1.– Воп. 10. – Спр. 131.

6. Дело по обвинению Наумовца Владимира и других в принадлежности к КПЗБ // ДАБВ / – Ф. 2042.– Воп. 1. – Спр. 12058.

7. Стасевіч, П.С. Вёска над Ясельдай: Гіст.-краязн. нарыс. – Мінск: Полымя, 1991. – С. 101.